# Гісторыя сведчыць

Паводле Рыжскай мірнай дамовы, у 1921 годзе заходняя частка Беларусі ўвайшла ў склад Польшчы. Жыццё ва ўмовах падзелу на Заходнюю і Усходнюю Беларусь працягвалася практычна два дзесяцігоддзі. Дзве краіны, два лёсы, але адзін народ.

Ва ўсходняй частцы Беларусі наш народ будаваў уласную дзяржаўнасць, адраджаў нацыянальную культуру і адукацыю.

У складзе Польшчы заходнебеларускія землі былі аграрна-сыравінным прыдаткам, рынкам таннай рабочай сілы.

Невыпадкова на тэрыторыі Заходняй Беларусі разгарнуўся шырокі нацыянальна-вызваленчы рух супраць прыгнёту Польшчы, усе выступалі за адзіную ідэю – аб’яднанне краю і народа.

17 верасня 1939 года, выконваючы загад аб узяцці пад абарону насельніцтва заходніх беларускіх зямель, на тэрыторыю Польшчы ўвайшлі войскі Чырвонай арміі. Гэта дало магчымасць аб’яднаць дзве часткі нашай краіны ў адну, ліквідаваць знявагу беларусаў як нацыі.

Памяць пра гэты дзень увекавечана ў назвах вуліц, бульвараў, плошчаў многіх гарадоў і мястэчак Беларусі: у Мінску, Брэсце, Ашмянах, Мазыры, Століне, Ракаве і іншых. З 1921 года 17 верасня адзначаецца як дзяржаўнае свята – Дзень народнага адзінства.

Сёння беларускі народ аб’яднаны ідэяй стварэння моцнай, суверэннай і квітнеючай краіны. Устанаўленне Дня народнага адзінства 17 верасня ўвасабляе пераемнасць пакаленняў, непахіснасць і самадастатковасць беларускай нацыі і дзяржаўнасці.